Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар
па навуковай рабоце БДУКМ
_________________В. Р. Языковіч
«_____» _________________ 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД- _______/вуч.

# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)*

2019

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная праграма распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-23 01 12-2013 па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), рэгістрацыйны № Е 23-1-87/17 вуч. ад 04.07.2017 г.

**СКЛАДАЛЬНІК**

*В. М. Сакалова,* старшы выкладчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*В. У. Пазнякоў*, прафесар кафедры маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», доктар філасофскіх навук, прафесар;

*А. М. Нароўская,* дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 31.08.2018 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 25.10.2018 г.)

Адказны за рэдакцыю: *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск: *В. М. Сакалова*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вывучэння адной з базавых вучэбных дысцыплін у сістэме вышэйшай культуралагічнай адукацыі абумоўлена яе значным патэнцыялам для ўсебакавога развіцця, павышэння агульнай культуры асобы, фарміравання сістэмы каштоўнасцей і ідэалаў гуманістычнага светапогляду. Веданне асноў тэорыі і гісторыі культуры з'яўляецца неад'емнай часткай прафесійнага майстэрства спецыялістаў у музейнай справе і ахове гісторыка-культурнай спадчыны, сродкам сацыяльна-культурных зносін, забяспечвае эстэтычнае і патрыятычнае выхаванне.

Праграма, створаная на падставе тыпавой вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) (рэг. № ТД-Е 804/тып. ад 23.04.2018), прадугледжвае сістэматызаванае вывучэнне тэарэтычна-практычнага матэрыялу, які неабходны студэнтам для лепшага засваення імі вучэбных дысцыплін спецыялізацыі.

*Мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя і гісторыя культуры» з'яўляецца набыццё студэнтамі базавых ведаў аб агульных заканамернасцях генезісу культуры, асаблівасцях яе будовы і функцыянавання, феноменах, універсаліях, канцэптах; спецыфіцы гістарычнага развіцця сусветнай і нацыянальнай культур, спосабах і праблемах іх узаемадзеяння.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны*:

– фарміраванне ўяўлення пра сутнасць і развіццё культуры, разнастайнасць яе форм і тыпаў;

– атрыманне ведаў аб метадах даследавання культуры;

– апісанне і супастаўленне розных тыпаў культур на падставе выяўлення агульных рыс для вызначэння гістарычных тыпаў культуры, вылучэння тыпалагічных характарыстык;

– фарміраванне навыкаў самастойнага вывучэння канкрэтных культур;

– далучэнне да класічных узораў сусветнай і нацыянальнай культурнай спадчыны.

Вучэбная дысцыпліна «Тэорыя і гісторыя культуры» прадугледжвае актуалізацыю міжпрадметных сувязей з такімі вучэбнымі дысцыплінамі дзяржаўнага кампанента, як «Філа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

софія», «Гісторыя Беларусі (у кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)», а таксама вучэбнымі дысцыплінамі кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі «Усеагульная гісторыя», «Усеагульная гісторыя мастацтваў», «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны», «Этналогія і этнаграфія Беларусі» і некаторымі іншымі.

Вучэбная дысцыпліна «Тэорыя і гісторыя культуры» з'яўляецца базавай для вывучэння вучэбнай дысцыпліны другой ступені вышэйшай культуралагічнай адукацыі «Філасофія і метадалогія навукі».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– базавыя паняцці і праблематыку дысцыпліны;

– эвалюцыю культуралогіі і культуралагічныя школы;

– важнейшыя метадалагічныя парадыгмы, прынцыпы і метады культуралогіі, якія забяспечваюць разуменне культуры як інтэгратыўнай сістэмы;

– заканамернасці культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва;

– асноўныя этапы гісторыі сусветнай і нацыянальнай культуры, заканамернасці іх паслядоўнага развіцця;

– суадносіны культуры і цывілізацыі, характэрныя асаблівасці розных тыпаў культуры, у тым ліку сучаснай айчыннай культуры;

– асноўныя дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай сусветнай культуры;

*умець:*

– характарызаваць асноўныя этапы ў гісторыі сусветнай і нацыянальнай культуры, заканамернасці іх развіцця;

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучаснай культуры;

– аналізаваць ва ўзаемасувязі развіццё культуралогіі, рэлігіі, філасофіі, дасягненні навукі і адукацыі;

– ужываць асноўныя паняцці і факталагічны матэрыял па тэорыі і гісторыі культуры ў будучай тэарэтычнай і практычнай дзейнасці;

– выкарыстоўваць культуралагічныя веды аб сацыядынаміцы, тыпалогіі і класіфікацыі культур у міжкультурнай камунікацыі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вызначаць месца і ролю беларускай культуры ў гісторыі сусветнай культуры;

*валодаць:*

– асноўнымі паняццямі і тэрмінамі спецыяльнай лексікі;

– сучаснымі метадалагічнымі канцэпцыямі ў галіне тэорыі і гісторыі культуры;

– актуальнымі метадамі і прыёмамі комплекснага аналізу пэўных артэфактаў культуры, культурных з'яў, сацыякультурных сітуацый.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя і гісторыя культуры» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступных *акадэмічных кампетэнцый:*

АК-1. Валодаць і ўмець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

Студэнт павінен развіць наступныя *сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:*

САК-1. Валодаць грамадзянскімі якасцямі.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобаснай камунікацыі.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Умець фарміраваць і абараняць уласныя меркаванні.

Студэнт павінен набыць наступныя *прафесійныя кампетэнцыі:*

*арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць:*

ПК-7. Выкарыстоўваць у прафесійнай дзейнасці найноўшыя інфармацыйныя тэхналогіі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*аналітычная дзейнасць:*

ПК-8. Дыялектычна мысліць і аргументаваць свой пункт погляду, аналізаваць факты і прагназаваць развіццё падзей, распрацоўваць рашэнні з улікам эканамічных, сацыяльных і этычных патрабаванняў, ацэньваць гістарычныя і сучасныя праблемы і тэндэнцыі, рыхтаваць навуковыя матэрыялы, рэфераты, агляды, рэцэнзіі.

ПК-10. Прадстаўляць вынікі работы ў выглядзе справаздач, рэфератаў, артыкулаў, якія аформлены згодна з патрабаваннямі і выкананы на падставе сучасных сродкаў рэдагавання і друку;

*навукова-даследчая дзейнасць:*

ПК-11. Фармуляваць і вырашаць задачы, якія ўзнікаюць у працэсе навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці і патрабуюць паглыбленых прафесійных ведаў.

ПК-12. Выбіраць неабходныя метады даследавання, мадыфікаваць існуючыя і распрацоўваць новыя метады згодна з задачамі канкрэтнага даследавання;

*педагагічная дзейнасць*:

ПК-13. Творча прымяняць атрыманыя веды і набытыя навыкі ў прафесійнай дзейнасці;

*кансультацыйная дзейнасць:*

ПК-15. Праводзіць кансультаванне па пытаннях музейнай справы, арганізацыі турызму і аховы гісторыка-культурнай спадчыны;

*інавацыйная дзейнасць:*

ПК-18. Працаваць з навуковай і метадычнай літаратурай.

Пры вывучэнні дысцыпліны мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя *метады навучання:* тлумачальна-ілюстратыўны, эўрыстычны, кейс-метад (метад сітуацыйнага аналізу), метад уключанага назірання, вучэбнае мадэляванне практыка-арыентаванага навуковага даследавання.

У рамках фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў пры правядзенні семінарскіх заняткаў выкарыстоўваюцца методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя і гісторыя культуры» ўсяго прадугледжана 524 гадзіны, з якіх аўдыторных заняткаў 238 гадзін. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 140, семінары – 98.

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залік, экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Тэорыя і гісторыя культуры ў сістэме гуманітарных ведаў. Культура як форма жыццядзейнасці грамадства і аб'ект вывучэння. Паняцце культуралогіі, яе прадмет і задачы. Структура і спецыфіка культуралагічных ведаў. Сістэма навук аб культуры, сувязь з філасофскімі і сацыяльна-гуманітарнымі дысцыплінамі. Катэгарыяльны апарат культуралогіі. Фундаментальны і прыкладны аспекты культуралагічных ведаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэорыя культуры

### Р а з д з е л І. Навука аб культуры: гісторыя, прадмет даследу

*Тэма 1. Узнікненне і развіццё культуралагічных ведаў на розных этапах існавання грамадства*

Зараджэнне і развіццё ўяўленняў аб культуры. Разуменне культуры ў антычным грамадстве. Праблема духоўнага ўдасканалення асобы (Піфагор). Ідэя пайдэі. Культура як культ душы (Сакрат). Філасофская сістэма Платона. Крытыка цывілізацыйных дасягненняў (Дыяген). Лукрэцый Кар, Цыцэрон аб культуры. Паняцце атараксіі. Культура як культ маральнага выхавання (Сенека). Каштоўнасці ў сістэме светапогляду Тацыта.

Уяўленні аб сутнасці культуры ў Сярэдневякоўі. Кодэкс хрысціянскай маралі ў трактатах Тэртуліяна. Разуменне культуры ў працах філосафаў Сярэдневякоўя Аўгусціна Блажэннага, Фамы Аквінскага.

Дасягненні культуралагічнай думкі ў эпоху Адраджэння. Погляды на культуру М. Мантэня, Э. Ратэрдамскага, М. Кузанскага, Т. Кампанелы.

Культуралагічныя веды ў эпоху Асветы. Падыходы да культуры ў працах Р. Дэкарта, Дж. Лока, Ф. Бэкана, Дж. Віко, Ж.-Ж. Русо, Вальтэра, Т. Гобса.

Развіццё культуралагічных ведаў у індустрыяльным грамадстве. Культуралагічная праблематыка ў працах І. Канта, Г. Гегеля, Ф. Ніцшэ і іншых філосафаў.

Трактоўка культуралагічных праблем у XX ст. Феномен духоўнага фарміравання асобы ў працах рускіх філосафаў. Экзістэнцыяльная культурфіласофія. Постмадэрнісцкая трактоўка культуралагічных праблем.

*Тэма 2. Сутнасць паняцця «культура»*

Паняцце культуры як базавая катэгорыя культуралогіі. Этымалогія тэрміна «культура», яго полісемантычнасць. Асноўныя падыходы да вызначэння сутнасці культуры. Культура як вынік творчасці і асобая сфера дзейнасці. Культура як сума дасягненняў чалавецтва. Паняцце артэфакта. Культура як другая прырода. Аксіялагічнае (каштоўнаснае) вымярэнне культуры. Каштоўнасныя дамінанты ў розных тыпах культуры. Культура як разнастайнасць і самабытнасць розных грамадстваў і аснова форм жыццядзейнасці. Культура як спецыфічная сістэма ідэалаў і норм. Культура як духоўны кампанент сукупнай вытворчасці. Культура як пошук сэнсаў. Паняцце архетыпу. Культура ў знакавым, сімвалічным, моўным, кодавым адлюстраванні.

*Тэма 3. Функцыі культуры*

Поліфункцыянальнасць культуры. Класіфікацыя функцый. Асноўныя функцыі культуры: сацыялізацыі, трансляцыі сацыяльнага вопыту, пазнавальная (гнасеалагічная), пераўтваральная, камунікатыўная, каштоўнасная (аксіялагічная), рэгулятыўная (нарматыўная), творчая (крэатыўная), інфармацыйная, знакавая (semiятычная), адаптыўная, гульнявая, ідэалагічная, інтэграцыйная, кампенсаторная. Тэорыя функцый у працах Э. Касірэра. Дыялектыка функцыянальнасці і дысфункцыянальнасці. Функцыя вытворчасці новых норм, каштоўнасцей, значэнняў і ведаў. Адаптыўная функцыя. Камунікатыўная функцыя. Канцэпцыя Г. М. Маклюэна аб ролі камунікатыўных тэхналогій у гісторыі культуры. Тыпы камунікацыі: традыцыйная, функцыянальна-ролевая, масавая. Гульнявая функцыя культуры. Разуменне гульні ў працах І. Канта, Ф. Шылера, Ё. Хёйзінгі. Асаблівасці гульні.

Ідэалагічная функцыя. Ідэалогія як кампанент свядомасці суб’ектаў культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфармацыйная функцыя. Узроўні інфармацыйных патрэбнасцей суб'ектаў культуры: біялагічны, сацыяльны. Віды інфармацыі. Станаўленне інфармацыйнага грамадства.

Функцыя сацыялізацыі. Нормы і значэнні як сродкі сацыялізацыі індывіда. Статуснае засваенне культуры ва ўмовах масавай вытворчасці.

Інтэграцыйная функцыя. Распрацоўка тэорыі інтэграцыі прадстаўнікамі функцыянальнай антрапалогіі (Б. Маліноўскі, А. Радкліф-Браўн і інш.). Супярэчлівы характар інтэграцыйнай функцыі культуры.

Кампенсаторная функцыя. Формы духоўнай і псіхалагічнай разрадкі і адпачынку ад праблем тэхнагеннага свету.

*Тэма 4. Метадалогія даследаванняў культуры*

Метад як сукупнасць правіл, прыёмаў і аперацый практычнага або тэарэтычнага асваення з'яў і працэсаў культуры. Тэарэтычная распрацоўка праблем культуры. Розныя падыходы да аналізу феномена культуры: дыяхронна-сінхронны, анталагічны (Ф. Ніцшэ), фенаменалагічны (Э. Гусэрль), сістэмны (Л. Уайт, П. Сарокін), дзейнасны, аксіялагічны (Г. Рыкерт, В. Віндэльбанд, М. Вебер), функцыянальны (Б. Маліноўскі, А. Радкліф-Браўн, Т. Парсанс), сінергетычны (І. Прыгожын), цэласны (А. Фліер), герменеўтычны (Ф. Шлеермахер, В. Дзільтэй, Х. Гадамер, П. Рыкёр), філасофска-гістарычны (І. Гердэр), філасофска-антрапалагічны (Э. Тайлар), тэалагічны (П. Фларэнскі), семіятычны (Ф. дэ Сасюр, Р. Барт, Ю. М. Лотман, У. Эка), гульнявы (Ё. Хёйзінга, Х. Артэга-і-Гасет, Г. Гесэ). Канцэпцыя тыпаў навуковай рацыянальнасці В. С. Сцёпіна. Класічны, некласічны і постнекласічны тыпы рацыянальнасці.

Культуралагічныя ідэі Ф. Ніцшэ. Апаланічны і дыянісійскі пачаткі як універсальныя катэгорыі заходняй культуры. Даследаванне культуры прадстаўнікамі сацыяльнай і культурнай антрапалогіі (Э. Тайлар, Дж. Фрэзер, Р. Бенедыкт, М. Мід, Ф. Боас, Л. Фрабеніус, А. Кробер). Псіхааналітычная інтэрпрэтацыя культуры (З. Фрэйд, К. Г. Юнг, Э. Фром, В. Франкл, К. Хорні). Посткласічная мадэль культуры ў філасофіі экзістэнцыялізму (К. Ясперс, М. Хайдэгер, Ж.-П. Сартр, А. Камю). Структуралісцкі і постструктуралісцкі падыходы ў разуменні і даследаванні культуры (М. Фуко, К. Ляві-Строс, Ж. Дэрыда, Ж. Делёз, Ж.-Ф. Ліатар).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Р а з д з е л  II. Марфалогія культуры

*Тэма 5. Тэорыя культурных форм*

Культура як цэласная сістэма. Структура культуры. Каштоўнасці як сутнасць культуры. Ідэал – аб'ект культуры. Нормы (агульначалавечыя, нацыянальныя, класавыя, групавыя, міжіндывідуальныя, інстытуцыянальныя, этнаграфічныя, канвенцыянальныя) і іх функцыі. Формы як элементы структуры культуры. Паняцце культурных універсалій. Архетыпы – базісныя элементы культуры (Цень, Персона, Аніма, Анімус і інш.). Семіятычнае вымярэнне культуры. Разнастайнасць моў культуры. Культурны тэкст. Роля сімвала ў культуры. Семіясфера культуры. Духоўная і матэрыяльная формы культуры.

*Тэма 6. Духоўная культура, характарыстыка яе форм*

Вызначэнне паняцця «духоўная культура». Тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да вызначэння зместу духоўнай культуры. Міфалогія, рэлігія, філасофія, мастацтва як асноўныя формы духоўнай культуры.

Міфалогія як ранняя форма духоўнай культуры. Гістарычныя формы рэлігіі. Філасофія як асобая галіна духоўнай культуры.

Мастацтва як эстэтычна-вобразнае асваенне рэчаіснасці. Рэчаіснасць у слоўных адцягненых вобразах, увасобленых у літаратуры. Музыка як пазапрадметная, ідэальная форма мастацтва. Трыадзінства карыснасці, трываласці, прыгажосці ў архітэктуры. Жывапіс як форма фіксацыі колеравых адчуванняў. Трохмернасць формы ў скульптуры. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва як сінтэтычная форма дэкору. Тэатр як відовішчная форма драматычнага дзейства. Рухомыя зрокава-слоўныя вобразы ў кінамастацтве. Танец як адна з найстаражытнейшых праяў духоўнай дзейнасці чалавека.

*Тэма 7. Матэрыяльная культура: крытэрыі і змест*

Сутнасць і змест матэрыяльнай культуры. Катэгорыі матэрыяльнай культуры: пароды жывёл, гатункі раслін, культура глебы, будынкі і збудаванні, шляхі зносін і транспартныя сродкі, інструменты, прыстасаванні, абсталяванне, сувязь і сродкі сувязі, тэхналогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пароды свойскай жывёлы. Гатункі культурных раслін. Культываваныя (культурныя) глебы. Будынкі і збудаванні як артэфакты матэрыяльнай культуры. Развіццё шляхоў зносін і транспартнай сеткі як важкі фактар культуратворчасці. Інструменты, прыстасаванні, абсталяванне як культурная каштоўнасць і іх музейнае захаванне. Сувязь і сродкі сувязі на сучасным інфармацыйным этапе развіцця грамадства. Функцыянальнае ўдасканаленне асяроддзя пражывання чалавека з дапамогай тэхналогій.

## Р а з д з е л III. Тыпалогія культуры

### *Тэма 8. Тыпалогія як навуковы метад сістэматызацыі культур*

Паняцці тыпу, тыпалогіі і тыпалагізацыі культур. Праблема тыпалогіі ў фундаментальнай культуралогіі (М. А. Бярдзяеў, Ф. Ніцшэ і інш.). Крытэрыі тыпалагізацыі культур: лакальны (прасторава-геаграфічны), сацыяльны, фармацыйны, хаваналагічна-часавы, этнаграфічны, аксіялагічны і інш.

Прынцыпы тыпалагізацыі культур: фармацыйны, цывілізацыйны, канцэптуальны, культурна-гістарычны, рэгіянальна-тэрытарыяльны, этнанацыянальны, дэмаграфічны, рэлігійны і інш.

Гістарычныя тыпы культуры: прыродна-сімвалічны (старажытныя формы культуры), антрапакасмаганічны (Антычнасць), хрысціянска-рэлігійны (Сярэдневякоўе), універсальна-гарманічны (Адраджэнне), пратэстанцка-рэфармісцкі (Рэфармацыя), рацыянальна-нарматыўны (абсалютызм), крытыка-асветніцкі (Асветніцтва), рамантычна-ўтапічны (рамантызм), індывідуальна-прагматычны (другая палова XVIII ст.), таталітарна-бюракратычны, дэмакратычна-тэхнатронны, гуманістычны (XX ст.).

### *Тэма 9. Тыпалагічныя мадэлі культур*

Тыпы культур паводле О. Шпенглера. Прасімвал як універсальны сродак адлюстравання светаўспрымання калектыўнай душы. Тыпы душы культуры: апаланічны (антычная культура), фаўстаўскі (заходнееўрапейская, рамана-германская культура) і магічны (група магічных культур, напрыклад егіпецкая, арабская).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзейнасная прырода тыпаў культур паводле М. Я. Данілеўскага. Паняцце «восевага часу» ў тыпалогіі К. Ясперса. Чатыры гістарычныя культурныя тыпы: праметэеўскі, культуры старажытнасці, культура восевага часу, паслявосевая (тэхнічная) культура.

Канцэпцыя цыклічнага развіцця культур П. А. Сарокіна: ідэацыйны, сенсетыўны (пачуццёвы) і ідэалістычны тыпы культуры. Тыпалагічная мадэль паводле М. Мід: постфігуратыўная, кофігуратыўная, прэфігуратыўная культура. Паміж Усходам і Захадам: «даследзіны беларускага светапогляду» паводле Ігната Канчэўскага (Абдзіраловіча).

### *Тэма 10. Элітарная і народная культуры*

Элітарная і народная культуры: сутнасныя характарыстыкі.

Эліта як вышэйшы слой сацыяльнай структуры грамадства. Канцэпцыя элітарнай культуры ў працах М. А. Бярдзяева. Агульныя рысы, асаблівыя якасці і каштоўнасна-псіхалагічныя ўстаноўкі эліты. Нефармальная ўлада эліты. Характэрныя рысы элітарнай культуры. Карпаратыўны характар элітарнай культуры. Духоўны арыстакратызм. Эстэтычная свабода. Глыбіня зместу і арыгінальнасць. Вытанчанасць формы. Наватарства. Індывідуальны пачатак і камерцыйная незалежнасць.

Роля народнай культуры ў ідэнтыфікацыі і самазахаванні этнасу. Этнас як суб'ект народнай культуры. Індывідуальныя, групавыя, масавыя элементы народнай культуры. Функцыі народнай культуры: эстэтычная, выхаваўчая, утылітарна-практычная, абрадавая і інш. Ананімны, калектыўны, непрафесійны характар народнай культуры. Разнастайнасць форм народнай культуры: каляндарна-абрадавая і сямейна-абрадавая паэзія, народныя тэатр, музыка, танец, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Творчыя стасункі і ўзаемадачыненні народнай і элітарнай культур.

### *Тэма 11. Масавая культура*

Паняцце масавай культуры і яе характэрныя рысы. Масавая культура як прадукт постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) тыпу тэхналагічнага развіцця. Уплыў НТР, урбанізацыі, разбурэння лакальных супольнасцей і сацыяльных меж на фарміраванне масавай культуры. Месца сучасных сродкаў камуніка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыі і павышэння ўзроўню адукаванасці мас у дынаміцы масавай культуры. Дэмакратызацыя грамадства як каталізатар масавай культуры. Натуралізм як рыса масавай культуры.

Функцыі масавай культуры: забаўляльная, камерцыйная, кампенсаторная, нарматыўна-рэгулятыўная, знакава-семантычная (дэманстрацыйная), сацыялізацыйная.

Асноўныя жанры масавай культуры. Масавая літаратура і яе жанры. Мода як масавая з'ява. Папулярная музыка і яе жанры.

### *Тэма 12. Субкультура і контркультура*

Дамінантная культура, субкультура і контркультура: суадносіны паняццяў. «Субкультура» як навуковае паняцце. Асноўныя рысы субкультуры і фактары іх фарміравання. Тыпалогія субкультур. Сацыяльныя функцыі субкультуры. Прычыны актуалізацыі субкультурных утварэнняў у трансфармаваным беларускім грамадстве. Субкультурны выбух сучаснасці (А. Тофлер). Субкультурная стратыфікацыя: субкультуры моладзі ХХ – пачатку ХХІ ст. (хіпі, бітнікі, панкі, готы, скінхеды, хакеры, рокеры, байкеры і інш.).

Паняцце «контркультура», падыходы да яго азначэння. Характарыстыкі контркультуры. Месца і роля контркультуры ў гістарычнай дынаміцы. Спецыфіка ўзаемасувязей дамінантнай культуры, субкультуры і контркультуры ў гісторыі.

## Р а з д з е л IV. Культура. Асоба. Цывілізацыя

### *Тэма 13. Асоба ў прасторы культуры*

Канцэпцыі чалавека ў гісторыі заходнееўрапейскай антрапалогіі: касмацэнтрычная, тэацэнтрычная, антрапацэнтрычная, лагацэнтрычная, рацыяналістычная, сацыяцэнтрычная, антрапалагічная. Асоба як этычная істота.

Спосабы і формы засваення культуры асобай. Творчасць як асноўны тып асобаснай дзейнасці. Паняцце інтэрыярызацыі.

Этапы дынамікі ўваходжання чалавека ў культуру: хамінізацыя, інкультурацыя, акультурацыя. Хамінізацыя індывіда як этап інтэрыярызацыі. Інкультурацыя і яе механізмы. М. Мід, Д. Мацумота, М. Херсковіц аб сутнасці інкультурацыі. Спосабы перадачы культурнай інфармацыі: вертыкальная, гарызан-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тальная і непрамая трансмісіі. Агенты і інстытуты інкультурацыі. Псіхалагічныя механізмы інкультурацыі: імітацыя, ідэнтыфікацыя, пачуццё сораму і пачуццё віны. Акультурацыя і яе стратэгіі: асіміляцыя, інтэграцыя, маргіналізацыя, сепарацыя.

*Тэма 14. Культура і цывілізацыя*

Паняцце цывілізацыі. Асноўныя прыметы цывілізацыі. Тэорыі цывілізацыі ў даследаваннях XVIII–XX стст. Асаблівасці інтэрпрэтацыі цывілізацыі ў працах І. Канта, Ф. Ніцшэ, М. Бярдзяева, М. Хайдэгера, К. Ясперса. Суадносіны культуры і цывілізацыі ў разуменні О. Шпенглера, А. Вебера, А. Тойнбі. Канцэпцыі цыклічнага развіцця цывілізацый (М. Данілеўскі, О. Шпенглер, А. Тойнбі, П. Сарокін).

Тыпы цывілізацый і іх крытэрыі. Архаічная цывілізацыя. Усходні і заходні тыпы цывілізацыі, іх характэрныя рысы. Тэхнагенная цывілізацыя і яе асаблівасці. Два тыпы грамадства – індустрыяльнае і постіндустрыяльнае, інфармацыйнае. Фарміраванне глабальнай цывілізацыі, негатыўныя і пазітыўныя наступствы.

Канцэпцыі сутыкнення цывілізацый С. Хантынгтана, трэцяй хвалі Э. Тофлера, канца гісторыі Ф. Фукуямы.

*Тэма 15. Дынаміка культуры*

Паняцце культурнай дынамікі і яе асноўныя вытокі. Канцэпцыі дынамікі культуры. Флуктацыя культуры (П. А. Сарокін «Сацыяльная і культурная дынаміка»). Тэорыя адаптацыі Т. Парсанса. Лінейна-паступальныя, хвалепадобныя, цыклічныя, інверсійныя, выбуховыя змяненні (Ю. М. Лотман «Культура і выбух»). Крыніцы дынамікі культуры: традыцыі; інавацыі; дыфузія; запазычанні; сінтэз як узаемадзеянне і спалучэнне разнародных культурных элементаў. Традыцыя як крыніца культурнай дынамікі. Культурныя інавацыі і шляхі іх узнікнення. Этапы ўкаранення інавацыі ў культуры: адбор, мадыфікацыя, інтэграцыя. Узаемадзеянне культур, традыцый і навацый. Запазычанні як від культурнай дынамікі. Культурная дыфузія і яе напрамкі. Тэорыя дыфузіянізму (Ф. Ратцэль, Л. Фрабеніус, Ф. Грэбнер, К. Уіслер). Гарызантальны і вертыкальны напрамкі дыфузіі. Культурная дынаміка ва ўмовах сучаснай глабалізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 16. Прырода і культура*

Узроўні і сферы праяўлення суадносін прырода – культура. Асаблівасці спалучэння прыроды і культуры. Гістарычныя этапы і формы апазіцыі «прырода – культура». Першабытны этап. Нараджэнне цывілізацыі. Фарміраванне гарманічных адносін «натуры» і «культуры» як трэці гістарычны этап.

Інтэрпрэтацыя прыроднага і культурнага ў культурфіласофскай думцы. Погляды беларускіх мысліцеляў на суадносіны прыроды і культуры. Маральная філасофія Л. Залускага. Беларуская школа фізіякратаў (Г. Страйноўскі, Я. Храптовіч, Т. Млоцкі, А. Тызенгаўз і інш.) Роля прыроды ў станаўленні і развіцці культуры. Прыродныя сімвалы ў культуры. Ідэя пазнання прыроды і культуры (Ч. Дарвін, Э. Тайлар, Л. Морган, Л. Уайт і інш.). Тэорыя каэвалюцыі чалавека, грамадства і прыроды М. Маісеева. Экалагічныя праблемы сучаснай цывілізацыі (недахоп прыродных рэсурсаў, скарачэнне біялагічнай разнастайнасці, забруджванне паветра, планетарнае пацяпленне і інш.) і шляхі іх вырашэння. Узнікненне экалогіі як навукі.

## Гістарычная дынаміка культуры

### Р а з д з е л V. Раннія формы культуры

*Тэма 17. Культура першабытнага грамадства*

Канцэпцыі паходжання культуры. Сутнасць грамадска-гістарычнай (біясацыяльнай) тэорыі культурагенезу. Асноўныя перыяды развіцця першабытнай культуры: палеаліт, мезаліт, неаліт.

Асноўныя этапы культурнай эвалюцыі ў эпоху палеаліту: арыньякская, салютрэйская, мадленская культуры.

Архаічны (даміфалагічны) светапогляд. Татэмізм як адна з найбольш старажытных форм вераванняў эпохі палеаліту. Анімізм, фетышызм як тыпы светаадчування дагістарычнай эпохі. Абрады, табу, магія. Функцыі міфа ў культуры архаічнага грамадства. Рытуал і яго функцыі ў першабытным грамадстве. Дасягненні неалітычнай рэвалюцыі. Пахавальныя абрады і культ продкаў. Мегаліты: менгіры і дальмены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вобраз свету першабытнага чалавека (час, прастора, самаадчуванне). Рысы і асаблівасці першабытнага мастацтва. Пячорныя і наскальныя роспісы (Альтаміра, Ласко, Мантэспан, Тасілін-Аджэр, Чатал-Хююк і інш.). Помнікі першабытнай культуры на тэрыторыі Беларусі.

*Тэма 18. Культура старажытных цывілізацый Усходу*

Усход як культурная цэласнасць. Цывілізацыі Старажытнага Усходу ў мадэлі сусветнай гісторыі К. Ясперса. Культура «давосевых» цывілізацый. Характэрныя рысы старажытных цывілізацый: архаічная форма светаўспрымання, рытуальны, культавы характар сацыяльных узаемаадносін, высокаразвітая матэрыяльная культура, магічная, політэістычная духоўная культура, сінкрэтычны і манументальны характар развіцця мастацтва. Паняцце ірыгацыйнай культуры.

*Культура Старажытнай Месапатаміі*: Шумер, Аккад, Вавілонская дзяржава, Асірыя. Містыцызм і «магічная душа» ў культуры Месапатаміі (О. Шпенглер, М. Эліадэ). Культ лёсу. Развіццё рэлігійных уяўленняў. Пантэон багоў. З'яўленне пісьменнасці. Распаўсюджанне ведаў. Вытокі мастацкай творчасці. Сімвалізм выяў.

*Шумерская цывілізацыя.* Міфалогія шумераў. Узнікненне і развіццё пісьменнасці. Асноўныя дасягненні ў навуцы і тэхналогіях. Архітэктура шумераў (зікураты). Зараджэнне пісьменнай (піктаграфія, клінапіс) і прававой думкі ў Месапатаміі. «Эпас пра Гільгамеша» як літаратурны помнік старажытнасці.

*Вавілонскае царства.* Дасягненні ў будаўніцтве дзяржавы, права. Развіццё навукі. Вавілон – шэдэўр горадабудаўніцтва. Брама багіні Іштар. Вавілонская башня. Вісячыя сады Семіраміды. «Законы Хамурапі» – старажытны помнік прававой думкі.

*Асірыя.* Арганізацыя войска. Сталіца дзяржавы – горад Ніневія. Роспісы і барэльефы. Бібліятэка цара Ашурбаніпала.

*Культура Старажытнага Ірана. Арыяна.* Асаблівасці рэлігіі зараастрызму. «Авеста» – старажытнае свяшчэннае пісанне зараастрызму. Культура Персіі імперскага перыяду. Фарміраванне імперыі Кіра. Шэдэўр горадабудаўніцтва – сталіца імперыі Ахеменідаў горад Персепаль. Старажытнаперсідскі клінапіс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 19. Культура Старажытнага Егіпта*

Адметныя асаблівасці старажытнаегіпецкай цывілізацыі. Рэлігійна-міфалагічная сістэма Старажытнага Егіпта. Сакралізацыя культуры. Вярхоўныя божаствы. Піраміда як прасімвал егіпецкай культуры. Культ памерлых. Храмавыя комплексы Аменхатэпа ІІІ: Луксор, Карнак. Рэлігійная рэформа фараона Эхнатона. Мастацтва эпохі Эхнатона. Роля канона ў егіпецкай культуры. Каноны ў скульптуры, архітэктуры, жывапісе. Грабніца Тутанхамона – дасягненні ў дэкаратыўным мастацтве. Роспісы грабніц. Шэдэўры скульптуры. Літаратура Старажытнага Егіпта. Сувязь музыкі з культам. Храмы і скульптуры эпохі Рамсесаў: Абу-Сімбел.

Егіпет эпохі элінізму. Характарыстыка эпохі. Александрыя як культурны цэнтр. Александрыйская школа. Александрыйскі маяк – адно з цудаў свету.

Рымскі перыяд у развіцці культуры Егіпта.

Развіццё навуковых ведаў (матэматыка, астраномія, медыцына, муміфікацыя, ваенная справа і інш.).

Матэрыяльная культура Старажытнага Егіпта. Жыллё, характар забудовы гарадоў. Адзенне егіпцян.

### *Тэма 20. Культура Старажытнага Кітая*

Перыядызацыя старажытнакітайскай культуры, асаблівасці фарміравання.

*Перыяд архаікі.* Культура першых дзяржаў. Эпоха Шан. Эпоха Чжоу. «Сто школ» у філасофіі Кітая. Фарміраванне асноўных філасофскіх школ: канфуцыянства, маізм, даасізм, легізм. *Перыяд класікі.* Утварэнне імперыі Цынь. Вялікая Кітайская сцяна. Імперыя Хань – залаты век у культуры Старажытнага Кітая. Вялікі шаўковы шлях. *Эпоха шасці дынастый.* Рост уплыву будызму на развіццё кітайскай культуры.

Традыцыяналізм кітайскай культуры. Канцэпцыя цэнтральнай дзяржавы. Культ імператара і продкаў. Сямейна-этнічныя адносіны.

Асноўныя філасофска-рэлігійныя вучэнні Старажытнага Кітая: канфуцыянства, маізм, даасізм, будызм. Паняцці «даа», «інь» і «янь» як аснова гармоніі свету. Даоскія тэхнікі самаўдасканалення. Канфуцыянская мараль і мадэль ідэальнага чалавека. Прынцып гармоніі ў канфуцыянстве. Будыйская маральная традыцыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рацыянальнасць мыслення як адметнасць кітайскага менталітэту. Навуковыя дасягненні. Уяўленні пра сусвет у «Кнізе змен» і «Кнізе гісторыі», ці «Кнізе дакументаў». Стварэнне іерагліфічнай пісьменнасці. Каліграфія. Кітайскі каляндар. Дасягненні кітайскай медыцыны. Мастацтва Старажытнага Кітая (літаратура, выяўленчае мастацтва, дойлідства, музыка, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва). Звычаі і абрады. Сістэма адукацыі і выхавання.

### *Тэма 21. Культура Старажытнай Індыі*

Гістарычныя тыпы індаарыйскай цывілізацыі. Протаіндыйская культура, індаарыйская культура, культура імперыі маўр'яў. Варна-каставая сістэма.

Развіццё міфалагічных, рэлігійных, філасофскіх уяўленняў аб свеце. Вучэнне аб душы, карме і сансары. Брахманізм, будызм, індуізм – асноўныя філасофска-рэлігійныя вучэнні. Важнейшыя прынцыпы будызму. Паняцце нірваны. Махаяна і хінаяна. Узнікненне індуізму. Веды – рэлігійна-філасофскі помнік. Вучэнне аб аватарах. Культ Брахмы, Вішну, Шывы. Культ Крышны. Крышнаізм.

Мастацкая культура Старажытнай Індыі. «Махабхарата» і «Рамаяна» – шэдэўры літаратуры сусветнага значэння. Значэнне танца ў індыйскай культуры. Пячорныя гарады і храмавыя комплексы. Прававая культура. Помнік старажытнаіндыйскага права «Законы Ману». Развіццё навукі і тэхнікі (астраномія, матэматыка, медыцына і інш.). «Камасутра» як энцыклапедыя сямейных адносін і крыніца мастацтва кахання.

### *Тэма 22. Культура Мезаамерыкі*

Тэорыі пра паходжанне і фарміраванне мезаамерыканскай цывілізацыі. Дакалумбава Амерыка, раннія цывілізацыі на амерыканскім кантыненце: культура альмекаў, майя, тальтэкаў, ацтэкаў, інкаў і інш. Асноўныя рысы культуры індзейцаў: рытуальны, культавы характар, міфалагічны светапогляд, манументальная, храмавая архітэктура і скульптура.

Дуалізм рэлігійна-міфалагічнай сістэмы альмекаў. Сувязь рэлігіі з сістэмай гаспадаркі.

Росквіт індзейскіх цывілізацый: зона высокіх цывілізацый майя, ацтэкаў (сучасныя тэрыторыі Мексікі, Гватэмалы, Гандураса і інш.) і імперыя інкаў (сучасныя Чылі, Перу і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пісьменнасць майя. Рэлігійна-міфалагічныя ўяўленні. Політэізм. Піраміды майя. Ахвярапрынашэнні. Касмалогія і касмагонія майя. Навуковыя дасягненні (астраномія, астралогія, медыцына і інш.). Каляндар майя.

Міфалогія ацтэкаў. Піраміды, храмы і свяцілішчы. Культавы каляндар. Уяўленні пра гісторыю чалавецтва. Адукацыя і пісьменнасць. Літаратурная спадчына. Эпас пра Кетцалькоатля.

«Залатая імперыя інкаў». Міфалогія і рэлігія інкаў. Пантэон багоў. Уяўленне пра боскую прыроду каменя. Пакланенне гарам, вадаёмам, раслінам. Рытуалы і святы. Мова кіпу (вузельчыкавае пісьмо). Адукацыя і рамёствы. Ткацтва. Сістэма музычнай адукацыі.

Мастацтва ў мезаамерыканскай культуры. Культавыя помнікі. Гарады. Жыллё.

## Р а з д з е л VI. Антычная культура

### *Тэма 23. Крыта-мікенская культура*

Рассяленне старажытных этнасаў у III–II тыс. да н. э. па Еўропе і Міжземнамор'і. Мінойская культура вострава Крыт. Адкрыцці А. Эванса. Кноскі палац. Сімволіка Лабірынта. Фарміраванне грэчаскай міфалогіі. Культ быка. Мінатаўр. Культавыя цырымоніі. Эпоха «палацавай цывілізацыі». Першыя дзяржавы з цэнтрамі-палацамі ў Кносе, Фесце, Маліі, Ката-Закра.

Росквіт цывілізацыі ахейскай Грэцыі. Будаўніцтва і афармленне палацаў у Мікенах, Тырынфе, Піласе. Адкрыцці Г. Шлімана, раскопкі Троі, Мікен, Тырынфа. Царскія ўсыпальні ў Мікенах. Пахавальная маска Агамемнана.

Сістэма пісьменнасці: лінейнае пісьмо А і лінейнае пісьмо Б.

Полісы-абшчыны як асноўная форма арганізацыі грамадства.

Мастацтва ў крыта-мікенскай культуры: сценныя роспісы, ювелірныя вырабы, кераміка, манументальная скульптура (Ільвіная брама).

Роля крыта-мікенскай цывілізацыі ў станаўленні антычнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 24. Культура Старажытнай Грэцыі*
*як пачатак і парадыгма еўрапейскай культуры*

Антычны тып культуры і яго адметнасці: антрапацэнтрызм, аганальнасць, антрапамарфізм, політэізм, міфалагічнасць і інш. Прынцып касмацэнтрызму ў старажытнагрэчаскай культуры. Асновы грэка-рымскай цывілізацыі (М. Я. Данілеўскі, О. Шпенглер, К. Ясперс).

Перыядызацыя старажытнагрэчаскай культуры.

*Гамераўскі (царскі) перыяд.* Зараджэнне асноў грэчаскай культуры.

Полісная сістэма дзяржаўнасці. Алімпійскія гульні. Вытокі старажытнагрэчаскага гераічнага эпасу. Гамер «Іліяда», «Адысея».

*Архаічны перыяд.* Асаблівасці міфалогіі антычнай Грэцыі: фарміраванне алімпійскага пантэона, асноўныя цыклы міфаў. Апалонаўскае і дыянісійскае ў культуры. Гераічны перыяд. Статус героя. Асноўныя героі, іх функцыі і дзеянні. Уяўленні грэкаў пра замагільны свет.

Узнікненне філасофіі і навукі. Праблема спалучэння рацыянальнасці і містыкі. Развіццё літаратуры. Сістэма родаў і жанраў у антычнай літаратуры (Арыстоцель «Паэтыка»): эпічныя, лірычныя, драматычныя жанры. Грэчаскі архітэктурны ордар. Скульптура. Дэкаратыўнае мастацтва.

*Класічны перыяд.* «Залаты век» Перыкла. Палітычная культура старажытных грэкаў. Фарміраванне тэорыі мастацтва. «Канон» Паліклета (скульптура «Дарыфор»). Класічны перыяд у гісторыі філасофіі (Сакрат, Платон, Арыстоцель, Дэмакрыт). Афіны – цэнтр адукацыі і культуры. Акадэмія Платона і ліцэй Арыстоцеля. Прамоўніцкае мастацтва (Дэмасфен). Гістарычная думка (Герадот, Фукідыд). Антычныя каляндарныя містэрыі і мастацтва драмы. Грамадскае значэнне тэатра. Творчасць Эсхіла, Сафокла, Эўрыпіда. Камедыі Арыстафана. Афінскі Акропаль – шэдэўр антычнай архітэктуры. Скульптары эпохі класікі. Музыка. Піфагораў лад. Светапогляд чалавека ў старажытнагрэчаскай культуры. Антычны ідэал калакагатыі і яго абгрунтаванне ў філасофіі Піфагора, Сакрата, Арыстоцеля. Канцэпцыя катарсісу ў Піфагора і Арыстоцеля. Тэорыя эстэтычнага выхавання. Сямейныя адносіны і быт грэкаў.

*Культура элінізму.* Сінтэз культуры Захаду і Усходу. Інтэнсіўнасць развіцця мастацтва. З’яўленне паняцця элітарнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя дасягненні эпохі. Цуды свету. Архітэктура і скульптура. Мастацтва як адлюстраванне змен у светаўспрыманні грэкаў. Карынфскі ордар як сімвал эклектызму. Сінкрэтызм у рэлігіі і міфалогіі. Філасофскія школы: скептыцызм, эпікурэізм, стаіцызм. Александрыя як навуковы цэнтр эліністычнага свету. Александрыйскі мусеён, Александрыйская бібліятэка. Прыродазнаўчанавуковыя дасягненні (Еўклід, Архімед, Апаланій Пергскі).

### *Тэма 25. Культурная спадчына старажытнарымскай цывілізацыі*

Спецыфіка культуры Старажытнага Рыма. Каштоўнасныя дамінанты рымскай культуры. Дзяржаўна-палітычныя і ідэалагічныя акцэнты ў культуры Старажытнага Рыма. «Civitas» як падмурак рымскай культуры. Пераемнасць і наватарства рымскай антычнасці.

Перыядызацыя старажытнарымскай культуры: этрускі і царскі перыяды; перыяд рэспублікі; перыяд імперыі. Уплыў грэчаскай культуры на рымскую цывілізацыю.

Асаблівасці міфалагічных і рэлігійных поглядаў рымлян. Канцэпт лёсу (фатуму) у сістэме каштоўнасцей рымлян. Міфалагізацыя гісторыі як характэрная рыса рымлян. Пантэон багоў Рыма (Марс, Юнона, Юпітэр і інш.). Крызіс старажытнарымскай рэлігіі. Хрысціянства як сінтэз іўдзейскай і антычнай культурных традыцый.

Палітычная і прававая культура Рыма (Гай Юлій Цэзар, Марк Тулій Цыцэрон, Палібій і інш.). Рымская філасофская школа (Марк Аўрэлій, Луцый Сенека і інш.). Стаіцызм. Рыторыка як адлюстраванне ментальнай асновы рымскай культуры. Тэатр і святы. Рымскае сцэнічнае мастацтва. Эвалюцыя сцэнічных жанраў: трагедыя, камедыя, народны фарс, атэлана, мім, пантаміма. Рымская літаратура ў сістэме культуры. Паэзія (Лукрэцый Кар, Катул, Вергілій, Гарацый, Авідзій). Рымскі раман. Музыка і яе месца ў сістэме старажытнарымскай культуры.

Навука і адукацыя. Класіфікацыя навук. Тэарэтычныя і эмпірычныя навукі. Сем вольных мастацтваў у сістэме рымскіх ведаў. Роля філасофіі ў сістэме навук. Рымскія гісторыкі. Рымскі энцыклапедызм. Формы сацыялізацыі і адукацыі ў старажытнарымскай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя архітэктурныя формы, тыпы будынкаў. Рымскае дойлідства. Скульптурны партрэт. Мастацкая спадчына Геркуланума. Раннехрысціянскае мастацтва і сімволіка. Уплыў культуры Рыма на станаўленне заходняй цывілізацыі.

## Р а з д з е л VII. Культура Сярэдневякоўя і Адраджэння

